Сила нашей внешней политики — в ее правдивости. Именно поэтому с быстротой молнии сообщения об Отчетном докладе ЦК КПСС на данном съезде полетели во все концы мира, во все столицы. Он встречен, это уже известно, с огромным интересом, как событие исключительно важного значения. Соответствующие правительства, деятели, слои населения делают свои выводы из доклада и вообще из работы съезда. Друзья мира рукоплещут нам. Для тех, кто проводит иной курс в международных делах, появились новые заботы. Но не нам проявлять заботу об их заботах.

Во внешней политике нашей страны всегда в единое целое спаяны ее революционная природа и последовательность в отстаивании дела мира, твердая защита государственных интересов Советского Союза и подлинный интернационализм. Советская внешняя политика — честная и открытая, в том числе по своим целям.

У нас нет территориальных притязаний ни к одному государству мира, нет намерения наносить ущерб чьим-либо законным правам и интересам. Но того же и мы требуем по отношению к нашей стране.

Кто действительно готов договариваться с нами по вопросам, требующим решения, всегда найдет в лице Советского Союза серьезного и ответственного партнера. Те же, кто хотел бы посягать на наши интересы и безопасность, на интересы и безопасность наших друзей и союзников, убеждаются каждый раз, что подобная политика не имеет будущего.

Сложность современной обстановки диктует необходимость видеть и точно намечать в международных событиях основные направления развития, видеть классовый смысл происходящего. «Марксизм,—учит В. И. Ленин,—требует от нас самого точного, объективно проверимого учета соотношения классов и конкретных особенностей каждого исторического момента. Мы, большевики, всегда старались быть верными этому требованию, безусловно обязательному с точки зрения всякого научного обоснования политики».

Руководствуясь этим ленинским положением, партия поставила перед советской внешней политикой задачу обеспечить наиболее благоприятные условия для построения социализма и коммунизма, отвратить опасность новой мировой войны. На решении этой задачи сконцентрированы ее усилия.

Нам в равной мере чуждо — пасовать перед угрозами империалистов и увлекаться ультрареволюционной фразой. Как то, так и другое отражает недооценку сил и возможностей, которыми обладают социалистические государства, международное рабочее движение, все прогрессивные силы.

США и некоторые их союзники по агрессивным военным блокам прибегают к различным приемам, чтобы замаскировать свой курс в международных делах. Одновременно они пытаются бросать тень на внешнюю политику



Советского Союза, извращать ее содержание и цели. Изо дня в день машина пропаганды США — официальная и неофициальная — работает над тем, чтобы выворачивать факты наизнанку. В США не жалеют средств для этого. Те, кто это делает, хотели бы вычеркнуть из памяти народов действительные события.

Вот отдельные примеры.

Какое главное решение было принято совместно великими державами, бывшими союзниками по войне, чтобы принести в Европу прочный мир и навсегда выкорчевать корни агрессии? Это было Потсдамское решение, принятое сразу же после того, как была повержена гитлеровская Германия. Но вместо коллективной безопасности и сотрудничества с Советским Союзом на основе Потсдама державами Запада были навязаны раскол Европы на военные блоки, политика поддержания напряженности в Европе.

Женевские соглашения 1954 г. и 1962 г. были призваны служить миру в Индокитае, обеспечению независимости народов Вьетнама, Камбоджи и Лаоса. США участвовали в выработке этих соглашений и приняли их. Однако тех, кто определяет политику в Вашингтоне, это нимало не смутило, когда они решили развязать здесь агрессию, военный конфликт, самый опасный после второй мировой войны и самый кровопролитный.

Без прямой поддержки со стороны США агрессия Израиля против его арабских соседей сразу захлебнулась бы, а скорее всего не была бы развязана. Без такой поддержки израильские экстремисты не решились бы бравировать своим отказом выполнить решения ООН об освобождении оккупированных арабских территорий.

Все эти примеры говорят сами за себя. Они показывают, на чьей стороне историческая правда, какой бы отрезок времени ни взять — длительный или короткий.

Наша партия четко отделяет область идеологической борьбы, которая развертывается со всей силой и в которой не может быть ни мира, ни перемирия, от области наших межгосударственных отношений с капиталистическими странами, которые строятся на ленинских принципах мирного сосуществования. Советский Союз и его союзники предлагают решать все международные спорные проблемы мирным путем, путем переговоров.

Внешнеполитическая деятельность нашей страны после XXIII съезда КПСС значительно укрепляет надежды народов на мир. В Европе хорошо развиваются дела у нас с Францией. Намного шагнули вперед дела с Италией. Миллионы людей и за пределами стран социализма расценили подписание Советским Союзом и Польшей договоров с ФРГ и как свой собственный успех, как существенный вклад в нормализацию обстановки в Европе. Введение этих договоров в силу, урегулирование проблем, существующих в отношениях между ФРГ и социалистическими государствами Европы, проведение общеевропейского совещания по вопросам безопасности, успешное завершение переговоров по Западному Берлину — это важные шаги, которые предстоит сделать на пути от Европы конфликтов к Европе прочного мира.

Это лишь несколько вопросов, решение которых возможно и необходимо. С такой же энергией Советский Союз будет добиваться решения других проблем и программных задач, четко сформулированных в Отчетном докладе ЦК КПСС.

Под ударами народов рухнули колониальные империи, мрачные громады которых создавались угнетателями, казалось, навечно. Но сегодня не все еще колониальные тюрьмы разрушены. Роль Советского Союза в решении этой важной международной задачи исключительно велика и не только потому, что здесь имеют важное значение наши практические шаги в политике, но также потому, что само наше мировоззрение, пример нашего многонационального государства взрывают, быть может, наиболее эффективно политику национального и расового гнета.

Крупное завоевание внешней политики социализма и всех сил мира состоит и в том, что теперь подавляющее большинство государств стоит на почве мирного сосуществования как единственно разумной альтернативы войнам. Наша партия, наша страна делают все для того, чтобы этот ленинский принцип еще шире и прочнее утверждался в международных отношениях.

В этой связи, как и прежде, возникает вопрос о наших отношениях с Соединенными Штатами Америки. Наша линия в этом вопросе излагалась неоднократно. Она хорошо и четко изложена и в Отчете ЦК КПСС на данном съезде. В Вашингтоне должны со всей серьезностью взвесить все то, что было сказано Генеральным секретарем ЦК КПСС в докладе от имени нашей партии и страны.

Советский Союз выступает за нормальные отношения с США. Он считает возможным улучшение советско-американских отношений. Но заявления Вашингтона в пользу переговоров должны подкрепляться практическими делами. С американской стороны далеко не всегда, чтобы не сказать больше, проявляется готовность это делать. Мы не сторонники переговоров, похожих на фехтование. Мы за серьезные переговоры. Мы за то, чтобы их участники не подставляли один другому ногу, а действительно искали соглашения.

Можно было бы многое сказать в этой связи о том, что происходит на переговорах по Западному Берлину, в ходе которых хоть отбавляй тех зигзагов, о которых так метко говорил товарищ Л. Брежнев, касаясь наших отношений с США; это же можно сказать о переговорах по созыву общеевропейского совещания, по вопросам Ближнего Востока, по сдерживанию гонки стратегических вооружений. Если у американской стороны действительно есть намерение способствовать достижению соглашений, то кто же мешает его проявить?

Вопросам наших отношений с Китаем партия и страна придавали и придают, как известно, большое значение. Наша политика сформулирована в Отчетном докладе. Она выражена товарищем Л. Брежневым убедительно и с большой силой логики. Ясно показано, какие положительные последствия имели бы народы Советского Союза и Китая от улучшения советско-китайских отношений; показано и то, какое огромное значение это имело бы для общей борьбы против империализма и агрессии. От руководителей Китая, от китайской стороны зависит, в каком направлении будут развиваться отношения между Советским Союзом и Китайской Народной Республикой.

Наша страна миролюбивая. Она доказывает это словом и делом. В выступлениях делегатов съезда с полным основанием и убедительно говорится о хорошей моральной атмосфере, которая установилась в нашей партии и стране в результате работы, проводимой ЦК. С таким же основанием мы можем сказать, что и вовне Советский Союз создал атмосферу большого к себе доверия. И эта морально-политическая атмосфера много значит на весах международной политики.

И сейчас, в дни съезда, миллионы и миллионы людей за рубежом всматриваются и вдумываются в то, что происходит в Кремле. Это делают наши друзья. Это делают и наши политические противники. Все знают, что здесь обсуждаются и решаются серьезные дела как внутреннего строительства, так и внешней политики, что отсюда, из Кремля, радирует колоссальная сила наших планов развития страны, миролюбие внешней политики. И мы, коммунисты, как и весь советский народ, выражаем глубокое удовлетворение по поводу такого воздействия наших успехов, успехов нашей политики мира, наших бессмертных коммунистических идей, которые мы несем во внешний мир своими делами, своим примером.

Каждый произведенный в стране станок, каждая тонна металла, каждая новая электронно-вычислительная машина и каждый центнер зерна — это не только вклад в подъем нашей экономики и благосостояние народа, но и вклад в нашу внешнюю политику.

Перед страной стоят на международной арене крупные и сложные задачи. Работы будет много, и работа будет трудная. Для решения стоящих задач придется и впредь преодолевать противодействие сил агрессии. Но мы уверены, что и в предстоящие годы наша страна справится со своей исторической миссией оплота социализма, свободы народов и мира.

П. КОВАЛЬСКИЙ



# В БРЕСТСКИХ ЛЕСАХ



Записки партизана

(Продолжение. Начало в №№ 13, 14).

И бабушка Христина не может ходить... Не хочу, чтобы все погибали...

Она выскользнула из дома, исчезла в темноте. А несколькими минутами позже, прихватив из-под лавки короткий железный ломик, вышел и Иван Беренчик. Он сразу нырнул за сарай и притаился возле стены: слышно было, как неподалеку от избы, тяжело топая и громко матерясь, шагают по направлению к деревне разозленные неудачей полицаи. Потом — то ли показалось, то ли на самом деле — где-то поодаль, на огородах испуганно заплакал в ночной темноте маленький ребенок. И тотчас в ответ забухали винтовочные выстрелы, рванула настороженную, тревожную тишину недлинная пулеметная очередь.

Утром на огородах нашли залитые кровью трупы Надежды и Нюры. Возле калитки собственного дома лежал и труп Нины Янкович, которой кто-то проломил голову валявшимся тут же ломом. Осатаневший от ярости Степан Сердюк поклялся, что за смерть невесты не пощадит ни одной партизанской семьи, как не пощадил он ни жену, ни маленькую дочку Юлия Беренчика...

Долго молчал Юлий, с окаменевшим лицом слушая трагический рассказ разведчиков. Молчали и мы, не в силах найти слова, которые могли бы если не унять, то хотя бы умерить, ослабить его невыносимую, нечеловеческую боль. Наконец тягостное молчание нарушил Василий Монахов.

— Будь она проклята, эта война! — глухо заговорил он.— Мои погибли, теперь твои... Женщины... Дети... А выродок Степка грозится и других со света сжить! До каких же пор мы будем терпеть его?

— Я его на себя беру,— поднял Юлий загоревшиеся жгучей ненавистью глаза.— Своими руками уничтожу, а нет — тогда лучше и не жить мне!



## ПРАЗДНИЧНЫЙ САЛЮТ

Юлий Беренчик долго ходил молчаливый, задумчивый, тщетно стараясь скрыть от товарищей свое неизбывное горе. Наконец однажды, в самом конце октября, отозвал меня в сторонку, усадил на поваленную ветром сосну и, присев рядом, спросил:

— Ты о празднике не забыл?

— О каком? — не понял я.

Юлий удивленно поднял темные брови:

— О годовщине Октябрьской революции, о каком же еще. Всего неделя с небольшим осталась...

— Ну и что?

— А то, что я недавно с Монаховым виделся. Знатный подарок готовят: хотят в предпраздничную ночь немецкий эшелон рвануть. Чтобы, значит, как следует «порадовать» фрицев.

— Молодец Василь! — вырвалось у меня.— Может, и нас к этому делу подключат?

— Нет,— Юлий покачал головой,— обойдутся. Только и нам сложа руки сидеть не гоже. Кое-что и мы сделать должны...

...К вечеру шестого ноября мы опять были в районе Лесничевки и, дождавшись темноты, тронулись дальше. Юлий Беренчик, Костя Белокрылов и Вася Волков вскоре отделились от нас, ушли по болотной насыпной дороге в сторону Песков, а остальная группа из десяти человек направилась сначала к Речице, потом сухим лесом к Огородникам, и оттуда, в обход деревни Соколово, на шоссейную дорогу Картуз-Береза — Минск, протянувшуюся почти параллельно железнодорожной магистрали. Ночь выдалась темная, с несильным морозом, с первым снежком, похрустывавшим под ногами. Но не она тревожила нас и не задание, полученное группой, а неизвестность,



подстерегавшая Юлия и двоих его товарищей в Песках. Скупо и неохотно рассказал он о своем замысле,— видно, боялся, что начнем отговаривать. Только и сообщил, что успел обо всем договориться с «полицаем» Иваном Васильевичем Шульгой, который как следует «подготовит» Степана Сердюка, а заодно и предупредит живущую наотшибе подпольщицу Надю Казеко о предстоящем визите к ней партизан. Но как Шульга должен «готовить» фашистского выродка, о чем предупредить Надю — ни слова, и это тревожило больше всего. Сердюк подозрителен и хитер. Чуть заподозрит неладное — ни Шульге, ни Казеко, ни Беренчику с его ребятами живыми из деревни не выбраться. А в том, что именно в эту предпраздничную ночь Юлий решил рассчитаться с убийцей жены и дочери, сомнений быть не могло.

Мы шли уже больше часа, прижимаясь к обочине шоссе, по обеим сторонам которого раскинулись топкие болота, пока, наконец, не добрались до деревянного моста через неширокую речушку. Подрывники сто двенадцатого должны были вот-вот подорвать на протянувшейся параллельно железной дороге вражеский эшелон. Значит, пока там не восстановят путь, фашистские автоколонны будут двигаться к Минску по этому шоссе, через этот мост. Но если мы уничтожим его, в Минск не попадет ни одна железнодорожная платформа, ни одна машина с предназначенным гитлеровской грабьармии вооружением и боеприпасами. Чем не подарок к празднику Великого Октября!

Однако уничтожить мост оказалось не просто и не легко. Большой, срубленный из толстых сосновых бревен, с настилом из досок, уложенных в елочку, он был настолько пропитан сыростью затяжных осенних дождей, что даже с помощью принесенного с собой в нескольких бутылках ке-



росина мы не смогли бы как следует подлечь эта-кую махину. Стоит появиться огню, и сразу примчатся фашисты из Картуз-Березы, полицаи из окрестных деревень: быстро потушат. А единственной имеющейся у нас миной мост не взорвать. Так что же делать?

Может, мы и не смогли бы ничего придумать, если бы не деликатный, неизменно вежливый Володя Трутько, вдруг многозначительно кашлянувший в кулак:

— Разрешите, товарищ майор?

— Давай, дорогой.

— Мину мы заложим на стыке шоссе и моста,— Володя даже на пальцах показал, как это надо сделать.— А рядом с ней и под мостовой настил приспособим бутылки с керосином. Чтобы, значит, когда рванет, керосин сработал по назначению. Ну, а для взрыва мины придется фашистов вызвать.

— Что-о?

— Очень просто: шевельнем маленько соколовских полицаев, они и вызовут из Картуз-Березы фрицев на подмогу. Те непременно на машинах помчатся, чтобы нас не упустить...

— Значит, мину ставить с расчетом на машину? — поняв замысел Трутько, деловито перебил бывший минер Вася Ермилов.

— Точно,— кивнул Володя.

С бутылками и с установкой мины ребята покончили быстро. Но все наши старания чуть было не пошли прахом: на шоссе, по ту сторону моста, послышались неторопливые шаги по асфальту и хриплые, простуженные голоса немцев.

— Ложись! — шепотом подал я команду.— Не стрелять. Если сюда подойдут, брать без звука.

Но гитлеровцы остановились, не доходя до моста, поболтали о чем-то своем, закурили и опять



неторопливо направились назад в сторону Картуз-Березы.

— Патруль ихний,— рассмеялся Володя Сутягин.— Опять же очко в нашу пользу: убедились, что все тихо, теперь не скоро придут.

Нам тоже не было смысла задерживаться здесь, и группа начала отход к деревне Соколово.

— А может, на хутор Смолярку для верности заглянем? — предложил Трутько, уроженец деревни Огородники, наперечет знавший всех жителей окрестных сел и хуторов.

— Это зачем?

— Есть у меня там дядька один на примете. Из таких, что побогаче. С полицией, слыхать, дружбу водит. К нему бы, а?

— Да что нам у него делать, у этого твоего дядьки?

— Я же говорю, он с полицаями нюхается, — в голосе Володи зазвучали смешливые мальчишеские нотки. — Головой ручаюсь, что как только мы уйдем, он сразу к ним в Соколово побежит. Разве плохо?

Но прежде чем свернуть на хутор, мы оборвали немецкие телефонные провода на нескольких придорожных столбах. Делали это просто: становились друг другу на плечи — и камнем по фарфоровым чашечкам, так что мелкие осколки брызгали во все стороны. А спущенный на землю провод хлопцы рубили на куски, забрасывая их подальше в болото.

Над хутором, погруженным в непроглядную темноту, висела густая, настороженная тишина. Даже собаки не встретили нас обычным лаем. А может быть, гитлеровцы успели перебить всех здешних собак? Однако дверь в доме, в которую постучался Трутько, распахнулась сразу, словно там ожидали ночных гостей, и пока мы один за



другим входили в просторную горницу, хозяин успел засветить огонек в лампе-коптилке. Приземистый, немолодой, с заросшим клочковатой бородой лицом, он хмуро глядел на нас недобрыми глазами из-под нависших бровей и сердито цыкнул на заголосившую было жену. Как заранее договорились, в «дипломатические переговоры» с хозяином вступил Володя Трутько. Он вежливо поздоровался, даже шапку снял и то ли потребовал, то ли попросил:

— Нам бы поесть, дядька. Нет-нет, не здесь: с собой возьмем. Сами понимаете, задерживаться не ко времени. Да и вам не с руки неизвестно кого в своей избе кормить...

От этих вежливых слов в бороде хозяина шевельнулась улыбка. Он ответил спокойнее, чем за минуту до того встретил нас:

— Мне вас и вправду кормить не с руки, как бы за это потом головы не лишиться. А хлеб — вон он, на полке. Берите, коли пришли.

— Только хлеба? — удивился Володя.

— В сенцах кадушка с салом, — все еще поеживаясь от страха, придвинулась к мужу хозяйка. И кланяясь чуть не в пояс, попросила: — Не обессудьте нас, люди добрые. С чем пришли, с тем и идите, пока никто не видит: на лбу не написано, откуда вас бог послал и кто вы такие...

— Это верно, — Трутько, соглашаясь, степенно кивнул. — Только одной-то буханки маловато. Вон сколько нас, да во дворе на случай чего в два с лишним раза больше...

— Вы берите, берите,— опять поклонилась хозяйка,— не обеднеем.

Покидая дом, Трутько напоследок посоветовал хозяевам:

— Свет ни к чему, погасите. И из хаты до утра советую не выходить: мы тут на всякий случай



мин понаставили. Счастливо вам оставаться...

Но едва мы отошли от дома шагов на двадцать, Володя схватил меня за руку и пригнул к земле:

— Гляди!

Все было тихо вокруг, пока глаза после света лампы привыкали к ночной темноте. Потом, чуть скрипнув, растворилась и тут же захлопнулась дверь в доме. А минуту спустя в боковой стене с сухим треском распахнулось окно и из него наружу вывалилась смутная темная мужская фигура. Мужчина постоял, прижимаясь к окну и прислушиваясь. Потом, сорвавшись с места, смешными скачками помчался в противоположную от нас сторону.

— Видали? — чуть слышно рассмеялся Володя. — Это он через наши мины сигает: мол, ежели и рванет, так, авось, осколками не достанет.

— Куда это его черт понес? — выругался я.

— Известно куда: в Соколово,— голос Трутько зазвучал жестко.— Дружков своих предупредить. Стукнуть бы их обоих, да, может, еще пригодятся...

Мы только-только успели добраться до половины пути между хутором и лесом, как в стороне станции Бронная Гора грянул глухой и тяжелый взрыв, вскинувший огненный сполох до самого черного неба.

— Монаховцы! — радостно вскрикнул Сутягин.— Ай да сработали. Кр-расота!..

И словно в ответ на его вскрик впереди, в Соколово, застучали винтовочные выстрелы, взахлеб затарахтел пулемет.

— Все, дальше можно не ходить,— остановился Трутько. — Бородач с хутора постарался. Ох и дают!

Чувствовалось, что недавний наш хозяин не на шутку всполошил полицейский гарнизон. С каж-



дой минутой пальба разрасталась, словно соколовские полицаи изо всех сил отбивались от навалившейся на них неведомой силы. Наша группа повернула назад к мосту, где вот-вот должно было решиться, удался наш замысел или нет.

До шоссе оставалось метров сто, когда и на мосту ахнул взрыв, а следом за ним ночную тишину разорвали многоголосые, истошные вопли и ругань немцев.

— Надо глянуть, что там произошло. — С этими словами Вася Ермилов вместе с Сутягиным исчезли в темноте.

Они вернулись минут через двадцать, запыхавшиеся от быстрого бега, но радостно взволнованные.

— Полный порядок! — еще издали шепотом доложил Ермилов. — Мост весь в огне, посредине головной грузовик полыхает: на трех машинах спешили, гады. Может, подкинем им своего огонька?

Но ввязываться в бой с фашистами не было смысла: задание выполнено, перерезаны и железная дорога, и шоссе. Сберегая немногочисленные наши боеприпасы, мы направились к месту условленной встречи с Юлием Беренчиком, в район Лесничевки. Теперь, когда самое трудное осталось позади, опять с тревогой думалось о товарищах: «Что с ними? Выберутся ли живыми из Песков?»

И будто теплом обдало, когда увидели живых и невредимых Беренчика, Белокрылова, Волкова. С ними был кто-то четвертый, и, приглядевшись, я узнал хрупкую, стройную, похожую на подростка Надю Казеко.

(Продолжение следует).

# КАЛІ ДУША ПЯВУЧАЯ...

Са сцэны ў залу льецца шырокая, напеўная, маркотна-задуменная мелодыя. Яна зачароўвае слухачоў, вядзе іх у неабсяжныя прасторы, на прыволле перадвячэрніх палёў і сенажацяў. «Вячэрні звон, вячэрні звон...» — чыста, да самазабыцця выводзяць баяны, пяшчотна, меладычна спяваюць домры. А балалайкі ўтораць, падпяваюць ім задушэўна і мякка.

Аркестр гучыць на дзіва зладжана, чуйна адклікаючыся на кожны рух дырыжора. І забываеш неяк, што перад табой не прафесіянальны калектыў, а музыканты-аматары. Збіраюцца яны па вечарах на рэпетыцыю, бяруць у рукі свае любімыя інструменты, і — педагог, рабочы, школьнік або майстар вытворчага навучання — усе ў гэтае імгненне становяцца аркестрантамі, артыстамі. Любоў да народнай песні, да музыкі прымушае іх, забыўшыся аб стомленасці і дзённых клопатах, развучваць новыя творы, зноў і зноў паўтараць старыя, даўно знаёмыя.

«Працавітасці і захопленасці нашых самадзейных музыкантаў можна пазайздросціць, — гаворыць арганізатар і нязменны кіраўнік аркестра, выкладчык Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Мікалай Прашко. — За пятнаццаць гадоў свайго існавання аркестр сыграў каля двухсот твораў. Тут народныя песні і танцы, музычная класіка, п'есы савецкіх кампазітараў. Вось толькі некаторыя з іх: вальс з балета П. Чайкоўскага «Спячая прыгажуня», «Сказ аб Байкале» М. Будашкіна, уступ да оперы Ж. Бізэ «Кармэн». Але асаблівай папулярнасцю карыстаецца ў нашым калектыве музыка беларускіх аўтараў. У розны час мы выконвалі фінал сімфаньеты і «Польку» М. Чуркіна, «Фантазію на тэмы песень Алоўнікава» Д. Камінскага, «Маладзёжны танец» П. Глебава, песні Ю. Семенякі, І. Лучанка».

З таго часу, як яны ўпершыню сабраліся разам, прайшло звыш пятнаццаці год. Усім малады быў іх кіраўнік. Ён толькі што скончыў музычны інстытут імя Гнесіных у Маскве і атрымаў накіраванне на работу ў Мінскае музычнае вучылішча. Улюбёны ў свой інструмент — балалайку, малады педагог Мікалай Прашко горача ўзяўся за арганізацыю аркестра рускіх народных інструментаў пры Мінскім палацы прафсаюзаў. У хуткім часе аркестр налічваў ужо больш за сорак музыкантаў.

Адна са старэйшых удзельніц калектыву Валянціна Гейдэ ўспамінае: «З нецярплівасцю чакалі мы рэпетыцый. Праходзілі яны вельмі цікава. Наш кіраўнік сваім энтузіязмам здолеў захапіць усіх, і маладых і старых. Многія з нас тады ўпершыню трымалі ў руках домру, балалайку. Толькі здаецца, што інструменты гэтыя нямудрагелістыя і іграць на іх проста. Не, каб яны заспявалі пад вашымі пальцамі, трэба мець чулыя рукі і пявучую душу, трэба любіць народную песню і ведаць яе тайну. Спасцігаць гэтую тайну і вучыў нас Мікалай Вікенцьевіч.

Вельмі ганарыліся мы, калі вясной 1957 года на гарадскім конкурсе, прысвечаным VI Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў, занялі трэцяе месца. Гэта ж было ледзь не адно з першых нашых творчых спаборніцтваў. Але самы вялікі поспех прыйшоў да нас у 1961 годзе, калі аркестру было прысвоена званне народны».

Сапраўды, прысуджэнне такога высокага звання сведчыць аб майстэрстве аркестра, яго музычнасці, гусце, з якім падбіраецца рэпертуар. Калектыў любіць і ўмее працаваць над творамі, даводзячы іх выкананне да найвышэйшай дасканаласці. «Аркестр рускіх народных інструментаў Мінскага палаца культуры прафсаюзаў наблізіў сваё выканаўчае майстэрства да прафесіянальнага ўзроўню», — адзначаў рэспубліканскі друк.

Пятнаццаць год — тэрмін не малы. За гэты час аматарскі аркестр атрымаў шырокае прызнанне, яго нярэдка запрашаюць на радыё і тэлебачанне. Некаторыя з удзельнікаў паспелі ўжо стаць бабулямі і дзядулямі, пайшлі на пенсію, але з аркестрам не разлучаюцца. Ветэранамі называюць у калектыве токара Г. Малішэўскага, бухгалтара В. Гейдэ, служачую Л. Іванову, кандыдата тэхнічных навук дацэнта М. Гусева, майстра М. Самадахава, якія актыўна займаюцца ў аркестры з першага дня яго існавання. Яны па-ранейшаму ўдзельнічаюць у аглядах, конкурсах і дэкадах, выступаюць з канцэртамі перад мінчанамі, робяць гастрольныя паездкі па гарадах і вёсках Беларусі.

Дарэчы, аб канцэртах і паездках. З'яўляючыся страснымі прыхільнікамі народнага мастацтва, музыканты-аматары імкнуцца энергічна прапагандаваць яго сярод слухачоў. Для сваіх выступленняў і паездак, таксама як і для рэпетыцый, яны выкарыстоўваюць звычайна толькі вольны ад асноўнай работы час або выхадныя дні. Аднак гэта не перашкодзіла ім пабываць у Салігорску, Гомелі, Жодзіна, Наваполацку, у многіх гарадскіх пасёлках, калгасах і саўгасах рэспублікі. Выязджалі яны і ў сталіцу братняй літоўскай рэспублікі — горад Вільнюс. Там беларускіх артыстаў прымалі вельмі цёпла і некалькі разоў выклікалі на «біс».

Цяпер ідуць апошнія рэпетыцыі праграмы, прысвечанай 50-годдзю прафсаюзаў Беларусі. У яе ўключаны і новыя творы Мікалая Прашко.

**Вера КІЗІЛ.**



**Вялікай папулярнасцю ў гледачоў карыстаюцца выступленні самадзейных артыстаў Мазырскага клуба «Будаўнік». Свае майстэрства яны дэманстравалі ў многіх гарадах рэспублікі. НА ЗДЫМКУ: артысты вакальна-інструментальнага ансамбля «Ліра-70» Ул. БАДАШКА, Ю. ГРЫЦКЕВІЧ, М. МІХАЙЛАЎ. Нядаўна на абласным аглядзе мастацкай самадзейнасці ансамбль атрымаў дыплом першай ступені.**

**Фота Я. КОСЦІНА.**

# ЯГО ПАКЛІКАЎ ТЭАТР

Бацькі ў Мікалая Напрыенкі — рабочыя. Працуюць яны на Мінскім аўтамабільным заводзе, ствараюць вядомыя ва ўсім свеце машыны з эмблемай зубра на радыятары. Дома ў іх заўсёды гавораць аб заводскіх справах і яшчэ — аб тэатры. Таму што для бацькоў Мікалая тэатр цяпер неаддзельны ад іх сына.

Калі пасля заканчэння сярэдняй школы пяць гадоў назад ён прыйшоў у штампавы цэх аўтазавода, то вырашыў, што тут, дзе працуюць бацька і маці, яго месца і прызванне. Толькі было гэта не зусім так.

Не, электрык Напрыенка не здрадзіў свайму заводу. Проста малады, дапытлівы хлопец з рознабаковымі інтарэсамі адкрыў у сабе яшчэ адну страсць — тэатр. Ён не прапускаў ніводнай прэм'еры ні на вялікай сцэне, ні ў самадзейных калектывах дома культуры завода. Потым Мікалаю ўжо было мала глядзець збоку на жыццё сцэны. Яму захацелася самому ўдзельнічаць у спектаклях. І тады ён прыйшоў на рэпетыцыю ў тэатр юнага гледача дома культуры завода.

Доўга ён прыглядаўся да ігры сваіх новых сяброў, убіраў у сябе ўсё карыснае і цікавае. Але сам іграць не рашаўся. Паўтара года Напрыенка хадзіў на рэпетыцыі, дапамагаў рабіць дэкарацыі. Нарэшце, атрымаў прапанову сыграць самастойную ролю. Згадзіўся адразу: вельмі падкупляла тое, што рэжысёр даручыў іменна тую ролю, якая ў спектаклі яму спадабалася больш за ўсё.

Пачалася напружаная работа над роллю. Вобраз Ягора Дубцова ў спектаклі «Спатканне ля чаромхі» па п'есе В. Ларава дастаткова складаны для пачынаючага артыста. Тым больш, што ролю гэту выконваў яшчэ і другі самадзейны акцёр, прычым даволі нядрэнна. Аднак у Мікалая яна атрымалася лепш...

З першым поспехам прыйшла вера ў свае сілы. З кожным спектаклем расло майстэрства. Цяпер яму амаль заўсёды даюць галоўныя ролі. І гэта не выпадкова. Уласцівыя Мікалаю ўпэўненасць, энергія, добрыя сцэнічныя даныя, талент пераўвасаблення дапамагаюць ствараць вобразы хвалюючыя і запамінальныя.

Мікалай шукае сам і дапамагае шукаць іншым. Ён не толькі самадзейны акцёр, але і рэжысёр. Напрыклад, над роляй Стрыбульскага ў спектаклі І. Мележа «Хто прыйшоў уначы» Напрыенка працаваў, займаючыся адначасова пастаноўкай спектакля «Пагібель Алмазава» па п'есе М. Альшанскага. Абедзьве гэтыя работы былі адзначаны дыпломамі заводскага фестывалю народных талентаў.

Мікалай Напрыенка паставіў ужо не адзін спектакль. Гэта «Першы сустрэчны» Прынцава, «Цяжкі экзамен» Сінельнікава, «Цаною жыцця» Рудога і іншыя. У рэжысёрскай рабоце Мікалаю дапамагаюць тонкі мастацкі густ і выдатны арганізатарскі талент.

Аддаваць столькі часу тэатру нялёгка, бо Мікалай Напрыенка ўжо другі год студэнт вячэрняга аддзялення Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Але ён не перастае іграць. Цяпер у калектыву народнага тэатра напружаны час. Рыхтуецца да прэм'еры п'еса Чапурына «Маё сэрца з табой». Напрыенка выконвае ролю вясковага хлопца, механізатара Аляксея Васільцова. Адначасова ён ставіць і свой спектакль «Абеліск» па п'есе Малініна.

**Святлана ГЕБЕЛЕВА.**

## ● хроніка культурнага жыцця ●

*ПАДВЕДЗЕНЫ вынікі ўсесаюзнага творчага спаборніцтва калектываў мастацкай самадзейнасці. Узнагароджана 200 калектываў, у іх ліку — аматары самадзейнасці Беларускай ССР: народныя хоры Брэсцкага абласнога савета прафсаюзаў, віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ», духавы аркестр Палаца культуры Аршанскага льнокамбіната, народныя ансамблі песні і танца Гомельскага палаца культуры чыгуначнікаў, Рэчыцкага палаца культуры, саўгаса «Натальеўск» Мінскай вобласці, народны тэатр палаца культуры Мінскага трактарнага завода і іншыя калектывы.*

*ТРЫ гады мінула з таго часу, як у Гродна пры гарадскім доме культуры быў створан ансамбль танца «Юнацтва». Узначаліла чго малады балетмайстар, выпускніца харэаграфічнага аддзялення Гродзенскага культасветвучылішча Людміла Крыштаповіч.*

*Ансамбль хутка стаў вельмі папулярны. Без яго ўдзелу цяпер не абыходзіцца амаль ніводзін агульнагарадскі канцэрт мастацкай самадзейнасці.*

*У рэпертуары самадзейнага калектыву — беларускія танцы «Лявоніха», «Янка», «Мікіта», рускія танцы, венгерскі «Чардаш», польская «Мазурка» і іншыя цікавыя нумары.*

*Цяпер калектыў працуе над харэаграфічнай кампазіцыяй «Незабыўны 1941-ы». У ёй мовай танца раскрываюцца гераізм і мужнасць савецкай моладзі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.*



**У МУЗЕІ гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ствараецца першая ў Беларусі дыярама «Мінскага катла» — грандыёзнай аперацыі па разгрому стотысячнай групоўкі фашысцкіх войск на подступах да беларускай сталіцы. Незабыўную карціну бою ў 1944 годзе стварае група мастакоў у складзе заслужанага дзеяча мастацтваў Пятра КРОХАЛЕВА, Уладзіміра ЛАГУНА, Барыса АРАКЧЭЕВА, Леаніда АСЯДОЎСКАГА. Дыяраму «Мінскага катла» мінчане змогуць убачыць у маі. НА ЗДЫМКУ: фрагмент дыярамы.**

# ЧАТЫРЫ ПАРЫ ГОДА

У Саюзе пісьменнікаў БССР адбылася выстаўка работ мастака-пейзажыста М. Даўгялы.

Чатыры пары года — вясну, лета, восень і зіму — паэтычна апеў мастак у 34 жывапісных работах, якія экспануюцца на выстаўцы. Радасць абуджэння прыроды пасля зімовага сну, сонечныя блікі на траве, густое лісцевае ўбранне лета, ціхі смутак прыроды восенню, цішыня зімовага марознага дня — усё гэта адлюстравана аўтарам з добрым мастацкім густам, багатай каларыстычнай гамай. Жывапісец тонка перадае прыгажосць роднай беларускай прыроды ва ўсёй яе разнастайнасці.

Асаблівую ўвагу звяртаюць на сябе работы «Лагойскае шасэ», «Вясновы матыў», «Вёска», «Дворык», «Восень пад Лагойскам» і іншыя.

М. Даўгяла шмат падарожнічае з эцюднікам па Беларусі. Ходзіць па палях, пералесках, вяртаючыся дамоў з серыямі новых малюнкаў.

Вялікую цікавасць выклікаюць у гледачоў пейзажы, створаныя на радзіме Янкі Купалы: «Зімовы дзень», «Грэчка цвіце», «Лета ў вёсцы Сялетчыкі ля Вязынкі».

У карціне панарамнага плана «Падмаскоўе» адчуваюцца эпічныя ноты. Каларыстычныя спалучэнні вобразна перадаюць прыгажосць мігатлівых даляў. Свежасць фарбаў, бадзёрасць настрою, тонкая перадача паветранай перспектывы вызначаюць пейзаж «Лыжнікі».

Мастак таксама дэманструе некалькі нацюрмортаў, якія ўзбагачаюць тэматыку выстаўкі.

# ШУМЯЦЬ БАРЫ НАД РОССЮ

Лес пастунова гусцее, падступае з усіх бакоў. Сярод меднаствольіх соснаў выдзяляюцца незвычайныя для гэтай мясцовасці дрэвы.

Заўважыўшы, што я прыпыніўся, дзядзька Мікола, ляснічы Роскага лясніцтва, пачаў тлумачыць:

— Гэта лістоўніца, карэнная сібірачка. Пераселеная з тайгі. Спецыялісты раней лічылі, што ва ўмовах беларускага клімату яе насенне не можа выспець...

Гадоў пятнаццаць назад гэтыя прыгажуні былі саджанцамі. Прывезлі іх тады з гадавальніка. Такія кволыя, што, здавалася, садзіць іх—марна траціць час.

І вось мінулай восенню Мікалай Іванавіч упершыню сабраў з іх насенне. Мяркуе стварыць спецыяльны гадавальнік. Лістоўніца — надзвычай каштоўнае дрэва. Па трываласці не ўступае дубу. З яе смалы атрымліваюць венецыянскі тэрпенцін, які шырока выкарыстоўваецца ў лакафарбавай прамысловасці.

Ідзём да новай дзялянкі. Мне прыпамінаецца ўсё, што расказваў роскі старажыл — дзед Міхал. Як за пяць ваенных гадоў прыкметна парадзеў лес, як загінулі сады. Там, дзе да вайны радавала вока белаpужовая яблыневая квецень, сіратліва чарнелі абгарэлыя ствалы.

Вяскоўцы пачалі прыносіць з лесу дзічкі. Але дрэўцы чамусьці прыжываліся дрэнна. Часцей за ўсё вясной яны так і не распускаліся.

Прапанову Мікалая Смірнова аб стварэнні гадавальніка падтрымалі ўсе. Так у 1949 годзе пад Ваўкавыскам быў пакладзен пачатак будучым лясам і садам.

Цэлымі днямі працаваў Смірноў на адведзенай дзялянцы. Адбіраў лепшыя гатункі. Сам рабіў акуліроўку яшчэ кволых саджанцаў. Чутка пра гадавальнік разышлася імгненна. За саджанцамі пачалі прыязджаць нават з суседніх рэёнаў. Клопатаў прыбавілася. А тут яшчэ надумаў вучыцца. Завочна скончыў дзесяцігодку, а крыху пазней атрымаў і дыпломам аб заканчэнні ляснога тэхнікума.

...Роўнымі радамі стаяць стромкія серабрыстыя таполі, розных гатункаў ясень, клён, амурскі аксамітны дуб. Усе яны пакуль што праходзяць стадыю выпрабавання.

Неяк да Мікалая Івачавіча дайшла чутка, што ў Зельвенскім раёне селекцыянеры вырасцілі кедр. Увесь дзень хадзіў узрушаны, а назаўтра паехаў да суседзяў паглядзець на новага сібірскага пераселенца. Вярнуўся адтуль з новымі задумамі.

Да добрай справы пацягнулася і моладзь. Пры Дыхнавіцкай і Роскай школах створаны невялікія эксперыментальныя лясніцтвы. Кіруюць імі вопытныя лесаводы і выкладчыкі батанікі. Часта бывае тут і ляснічы Мікалай Смірноў, які вырасціў за сваё жыццё амаль паўтара мільёна дрэў. За плённую працу Савецкі ўрад узнагародзіў яго ордэнам Леніна.

**Г. ПАШКОЎ.**

## СКРУТАК З-ПАД СТРАХІ

*Калі Міхаіл Дабрыян і яго сястра Лідзія, жыхары вёскі Сяргеевічы на Слонімшчыне, разбіралі стары хлеў, з-пад саламянага даху выпаў скрутак. У ім аказалася трыццаць легальных беларускіх газет розных назваў, якія выходзілі ў Вільні ў 1923—25 гадах, інструкцыі, брашуры, падпольныя газеты, лістоўкі.*

*Ёсць тут і дакумент, які характарызуе работу гуртка Грамады вёскі Сяргеевічы. Гэта падзяка за збор сродкаў для палітвязняў. Названы 23 прозвішчы тых, хто аказваў дапамогу. Невялікія былі сумы — 1—3 злотыя, 50—70 грошаў. Але яны сведчаць аб тым, што вясковая бедната спагадліва адносілася да палітычных зняволеных.*

*А вось пратэст сялян гэтай вёскі супраць арыштаў дэпутатаў і дзеячоў Грамады. Пратэст падпісалі 34 вясковыя жыхары.*

*Сярод знаходак — білеты членаў Грамады братоў Міхаіла і Пятра Дабрыянаў. Міхаіл памёр у 1927 годзе, а Пётр Дабрыян цяпер калгасны пенсіянер.*

*Вялікую цікавасць маюць газеты Грамады. Газеты левага напрамку часта канфіскоўваліся ў буржуазна-памешчыцкай Польшчы, таму яны час ад часу з'яўляліся пад новымі назвамі. У некаторых нумарах газет змешчаны карэспандэнцыі са Слонімшчыны. У іх расказваецца аб тагачасным сацыяльным і нацыянальным прыгнёце, барацьбе працоўных за свае правы.*

**Г. КАПУСЦІН.**

# ВЕСНАВЫЯ ЭЦЮДЫ





Фота К. ЯКУБОВІЧА і Ул. ЛУПЕЙКІ.

# ТРЫЦЦАЦЬ ЗОН АДПАЧЫНКУ

Комплекс піянерскіх лагераў «Івянец» — беларускі «Артэк» хутка вырасце ў адным з самых маляўнічых куткоў паўночнага захаду рэспублікі. Гэты комплекс разлічаны на 7 000 месц. Праект распрацоўваецца мінскім філіялам Цэнтральнага навукова-даследчага і праектнага інстытута па грамадзянскаму будаўніцтву.

Новая зона адпачынку—адна з трыццаці, стварэнне якіх плануецца ў недалёкім будучым. Беларусь стане папулярным месцам адпачынку працоўных нашай краіны. Дванаццаць тысяч вялікіх і малых азёр, сотні унікальных помнікаў архітэктуры, гісторыі, археалогіі, прыроды—усё гэта змогуць убачыць госці.

Значна расшыраць свае ўладанні ўжо вядомыя зоны адпачынку ля Нарачанскіх і Браслаўскіх азёраў, на берагах Прыпяці і Дняпра, Буга і Нёмана.

Край зялёных дуброў і смалістых бароў гасцінна сустрэне кожнага, хто захоча бліжэй пазнаёміцца з жыццём рэспублікі, цікава правесці свой адпачынак.

## ГУМАР

*Прахожага збіла машына. Ен падымаецца і лае шафёра:*

*— Вы не ўмееце вадзіць машыну! Вы ж і ўчора падбілі мяне!*

*— Добры дзень. Прабачце, я не пазнаў вас.*

●

*Паклоннік пытае сястрычку сваёй выбранніцы:*

*— Анечка, а ты мяне ведаеш?*

*— Ведаю, вы — апошняя надзея маёй сястры.*

●

*— Гэты біфштэкс — проста боская страва!*

*— Вы так думаеце?*

*— Толькі адзін бог ведае, што туды падмешана.*

●

*Тэлефон быў апісаны яшчэ ў біблії. Памятаеце, там сказана: «І клікаў Майсей пана бога тройчы, і ніхто не адказаў».*

●

*Пан Алоіс, які прыйшоў да Гражынкі, дае яе маламу брацiку тры кроны на карусель. Той вяртае яму крону:*

*— Чаму вы павінны плаціць на крону больш, чым астатнія?*

●

*Размаўляюць дзве сяброўкі.*

*— Я,— прызнаецца адна,— вельмі люблю рускую літаратуру...*

*— А хто твой любімы аўтар.*

*— Талстаеўскі.*

●

*— Толькі тыдзень прайшоў пасля вяселля, а ты вяртаешся дамоў так позна,— скардзіцца маладая жонка.*

*— Я не мог прысці раней, трэба ж было расказаць усім сябрам у кафэ, які я шчаслівы з табой.*

●

*МУЖ. Цяпер, пасля вяселля, я магу сказаць, дарагая, што і ў цябе ёсць недахопы.*

*ЖОНКА. Не намагайся, я іх усе ведаю сама. Гэта тыя недахопы, з-за якіх я не атрымала лепшага мужа, чым ты.*

●

*У рэстаран уваходзіць госць, а за ім сабака, кот, дзве курыцы. На стол ён ставіць клетку з папугаем і акварыум і звяртаецца да афіцыянта:*

*— Дайце ўсяму гэтаму пасці, жонка паехала адпачываць.*

## Ад Белавежы да Сахаліна ✕ Ад Белавежы да Сахаліна

### ДЛЯ ФАЗАНАЎ І КУРАПАТАК

Гэтыя птушкі прыносяць карысць сельскай гаспадарцы, але засталося іх вельмі мала. Шэрую курапатку яшчэ можна сустрэць на прынёманскіх палях, у пералесках, а фазана, напэўна, толькі ў Белавежскай пушчы. Як жа павялічыць колькасць каштоўных птушак? Гэтым пытаннем заняліся спецыялісты лясной гаспадаркі.

Каля вёскі Індура Гродзенскага раёна вырашана стварыць першую спецыялізаваную гаспадарку па развядзенню шэрай курапаткі і фазанаў. Месца для яе падабрана ўдалае. Вакол раздолле ўрадлівых ніў, невялікія лясы з ягаднікамі, узгоркі, рэчкі. У гаспадарцы намечана пабудаваць інкубатарную станцыю. У ёй прадугледжаны будынкі для маладняку, арыгінальныя вальеры, іншыя неабходныя памяшканні.

### МАРМУР... СА СЛАНЕЧНІКА

Прыгожыя сонечна-залатыя расліны, корм для жывёлы, алей — вось амаль і ўсё, што мы ведаем аб сланечніку. У выніку двухгадовых даследаванняў дацэнт Варонежскага лесатэхнічнага інстытута В. Жукаў і старэйшы выкладчык кафедры механічнай тэхналогіі драўніны А. Філонаў распрацавалі тэхналогію вырабу будаўнічых пліт з лузгі сланечніка.

На Старааскольскім маслазаводзе была спраектавана ўстаноўка па вытворчасці пліт. Яна ўжо дала першую прадукцыю.

Новы будаўнічы матэрыял паспяхова канкурыруе з драўніннымі плітамі. Ён лёгка паддаецца апрацоўцы, шліфоўцы. Пліты са сланечніка могуць быць выкарыстаны і ў мэблевай вытворчасці. Іх можна імітаваць пад малахіт, граніт, мармур. Мэбля з такой арыгінальнай расфарбоўкай выглядае эфектна, прыгожа.

### ЗНАХОДКА Ў КАСЦЁЛЕ

У мастацкай галерэі імя М. Чурлёніса ў Каўнасе выстаўлена трыццаць палотнаў буйных майстроў фламандскага і галандскага жывапісу XVI—XVII стагоддзяў. Вось малюнак «Распяцце» Пітэра Пауля Рубенса, напісаны маслам на дубовай дошцы. На думку мастацтвазнаўцаў, творы адносяцца да ранняга перыяду творчасці мастака. Вялікую каштоўнасць маюць работы фламандскага жывапісца Франса Снейдэрса. У калекцыі некалькі твораў і іншых выдатных мастакоў.

Гэтыя карціны ў свой час былі набыты ў Заходняй Еўропе літоўскімі і польскімі магнатамі, а потым перайшлі ва ўласнасць мастацкай галерэі. Калі гітлераўцы акупіравалі Каўнас і пачалі рабаваць музеі, адзін з работнікаў галерэі здолеў схаваць карціны—замураваў іх у сцяну аднаго са старажытных касцёлаў. Далейшы лёс гэтага чалавека невядомы. А калекцыю з таго часу лічылі загінуўшай. Толькі калі пачалі рэстаўрацыю касцёла, знайшлі ў яго сцяне каштоўныя творы мастацтва.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.

НАШ АДРАС: МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.

ТЭЛЕФОНЫ: 33-07-82, 33-03-15, 33-15-15, 39-87-92.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. № 461